имени Свердлова в районе д. Мотоль и д. Тышковичи. Враг использовал артиллерию, самолеты, танки, но не смог прорваться в партизанские лагеря. В д. Тышковичи в неравном бою с немецкими танками погибло 22 партизана. Погибших партизан с почестями похоронили в лесу, а после войны они были перезахоронены в братской могиле в д. Мотоль. Бригада имени Гуляева вышла из блокады между д. Гоще и д. Тышковичи, бригада «Советская Белоруссия» и бригада имени Свердлова оборону удержали до соединения с частями Красной Армии. Тысячи мирных жителей были спасены от неминуемой гибели» [2].

Таким образом, на территориях, освобожденных партизанами от немецких оккупантов, важное место в структуре органов советской власти занимали комендатуры в населенных пунктах. Они играли большую роль в соблюдении порядка, законности на территории партизанских зон. 16 июля 1944 года партизанский отряд имени Е. Макаревича (отряд насчитывал 486 человек) соединился с частями 55 гвардейской стрелковой дивизии 20-го стрелкового корпуса 28-й армии Первого Белорусского фронта.

**Список литературы**


1 Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944). Документы и материалы : в 3 т. / сост. : Р. Р. Крючок [и др.]. – Минск : Беларусь, 1967. – Т. 1. Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 г. – ноябрь 1942 г.). – 743 с.

2 Воспоминания Калильца Григория Никитича, 28.08.1924 года рождения, бойца партизанского отряда имени Е. Макаревича, записаны автором 14.07.1984.

3 **Стасевич, П. С.** Деревня над Ясельдой : ист.-краеведч. очерк / П. С. Стасевич. – Минск : Полымя, 1991. – 101 с.

4 Памяць : ист.-докум. хроника Ивановского района. – Минск : БЕЛТА, 2000. – 592 с.



УДК 94(476) «1941/.45»


# “РЭЙКАВАЯ ВАЙНА” НА ТЭРЫТОРЫІ АКУПАВАНАЙ БЕЛАРУСІ Ў АДЛЮСТРАВАННІ ГІСТАРЫЯГРАФІІ І КРЫНІЦ


*А. Г. ЦЫМБАЛ*

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт*


“Рэйкавая вайна” ўяўляецца адным з найбольш даследаваных у савецкай, расійскай і беларускай гістарычнай навуцы сюжэтаў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівасцю савецкага і постсавецкага наратыву гісторыі дыверсійнай дзейнасці на чыгунцы з’яўляецца падыход практычна цалкам

пабудаваны на дакументальнай спадчыне савецкага паходжання: матэрыялаў партызанскіх фарміраванняў, Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху.

Адной з першых прац, дзе разглядаюцца пытанні дыверсій на камунікацыях, з’яўляецца праца, аўтарства якой прыпісваецца Л. Цанаве, але даследванне не ўтрымлівае абагульненых дадзеных аб выніках дзейнасці партызан на чыгунцы [1, с. 521–641]. Больш дэталёвыя звесткі ўтрымліваюць познесавецкія выданні. Так, у грунтоўнай працы па гісторыі партызанскага руху “Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны” на падставе даных Беларускага штаба партызанскага руху сцвярджаецца, што на працягу 1943 г. партызаны Беларусі нанеслі значны ўрон нямецкім акупантам. За год баявых дзеянняў былі пушчаны пад адхон 6217 эшалонаў і 19 бронепаяздоў праціўніка. Пры гэтым выведзена са строю 4875 паравозаў, 43156 вагонаў, платформ і цыстэран. Партызаны разграмілі 22 станцыі, 35 вадакачак і 6 воданапорных веж, разбурылі 1556 км стальнога пуці, узарвалі 457 чыгуначных мастоў. У ходзе баёў знішчылі 284 казармы, 539 дзотаў і бліндажоў, 11585 т гаручага, 458 складоў з боезапасамі, харчаваннем, амуніцыяй і абмундзіраваннем. Забілі і паранілі некалькі дзесяткаў тысяч салдат і афіцэраў праціўніка [2, с. 244].

Паводле савецкай літаратуры, толькі за другі этап “Рэйкавай вайны” пад кодавай назвай “Канцэрт” беларускія партызан падарвалі каля 90 тыс. рэек, пусцілі пад адхон 1041 варожы эшалон, знішчылі 72 чыгуначных маста, разграмілі 58 гарнізонаў праціўніка, забілі і паранілі больш за 53 тыс. гітлераўцаў. Аперацыя “Канцэрт” выклікала сур’езныя цяжкасці ў перавозках нямецка-фашысцкіх войскаў, прапускная здольнасць чыгункі знізілася на 35–40 % [3, с. 95].

Аналагічныя вынікі аперацыі “Канцэнт” прыводзяцца ў энцыклапедыі “Вялікая Айчынная вайна 1941–1945”, якая паўтарае прыведзеныя раней лічбы, за адзіным выключэннем – вучоныя Інстытута ваеннай гісторыі Міністэрства абароны СССР у 1985 г. выкрэслілі лічбу забітых у выніку аперацыі гітлераўцаў – 53 тыс., а таксама адзначылі, што аперацыя была спынена ў сувязі з адсутнасцю выбухоўкі. Тым не менш, прапускная здольнасць чыгункі скарацілася на 35–40 % [4, с. 367]. Характарызуючы ў цэлым дзеянні партызан падчас аперацыі “рэйкавая вайна” па парушэнню працы чыгункі праціўніка і страты, нанесеныя немцам, сцвярджаецца, што толькі беларускімі партызанамі знішчана 836 эшэлонаў, 3 бронецягніка, падарвана 215 тыс. рэек, на некаторых шляхах рух быў затрыманы на 3–15 сутак, а магістралі Магілёў – Крычаў, Полацк – Двінск, Магілёў – Жлобін не функцыянавалі ўвесь жнівень 1943 г. [4, с. 608]. Выдадзеная практычна ў той жа час праца П. К. Панамарэнкі аднак сцвярджае, што не толькі за жнівень – верасень 1943 г., то бок час рэалізацыі аперацыі

“рэйкавая вайна”, але за ўвесь перыяд з 20 ліпеня 1943 г. па 1 снежня 1944 г. (пытанне тут выклікае і тэрмін па 1 снежня 1944 г.) толькі ў БССР было выведзена са строю 210 516 рэек, а ўсяго – 358 584 [5, с. 234].

Сучасная беларуская гістарыяграфія прыводзіць наступныя данныя. У. Лемяшонак у “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” ў асноўным паўтарае савецкія лічбы, сцвярджаючы, што за жнівень-верасень 1943 г. было ўзарвана больш за 121 тыс. рэек, пушчаны пад ахон 833 эшалоны, 3 бронецягнікі, узарваны 184 чыгуначныя масты, знішчана 1429 аўтамашын і вялікая колькасць жывой сілы. У выніку перавозкі германскай групы арміі цэнтр скараціліся на 40 % [7, с. 168]. А падчас аперацыі “Канцэрт” за час аперацыі на ўсёй савецкай акупаванай тэрыторыі было падарвана каля 150 тыс. рэек, у тым ліку больш 90 тыс. рэек на тэрыторыі Беларусі. Беларускія партызаны пусцілі пад адхон 1041 варожы цягнік, вывелі са строю 807 паравозаў, 6360 вагонаў-платформаў і цыстэрнаў, узарвалі 72 чыгуначныя масты, знішчылі больш за 400 км тэлефонна-тэлеграфных ліній, а прапускная здольнасць чыгунак знізілася на 40 %, што сур’ёзна паўплывала на забеспячэнне варожых войск [7, с. 95].

Зусім іншыя дадзеныя прыводзяць аўтары найноўшага выдання “Страна в огне”. Паводле падлікаў аўтараў на падставе справаздач БШПД за перыяд з лістапада 1942 па красавік 1943 г., беларускія партызаны пусцілі пад адхон 871 эшалон, у красавіку 1943 г. – 185 цягнікоў, у маі – 447 і 2 бронецягніка, у чэрвені – 598 эшалонаў і 3 бронецягніка, у ліпені – 761 эшалон і 2 бронецягніка. За час аперацыі “Канцэрт” здзейснена 1041 крушэнне цягнікоў. Усяго за перыяд з лістапада 1942 па лістапад 1943 г. атрымліваецца – 3903 цягніка і 7 бронецягнікоў [8, с. 524, 525, 530], што значна кантрастуе з лічбамі 6217 эшалонаў і 19 бронепаяздоў праціўніка, знішчаных у 1943 г. пазначанымі у працы “Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны” [2, с. 244].

Трэці этап “рэйкавай вайны” пачаўся напярэдадні аперацыі “Баграціён” у ноч з 19 на 20 чэрвеня 1944 г. і праводзіўся ў адпаведнасці з наступальнымі дзеяннямі Чырвонай Арміі і цягнуўся да поўнага вызвалення тэрыторыі Беларусі ад германскіх захопнікаў. Толькі за адну ноч (19 на 20 чэрвеня) было падарвана 40 775 рэек [9, с. 547–548], а ўсяго 61 тыс. рэек за перыяд аперацыі, што тлумачыцца тым, што “ахопленыя патрыятычным парывам партызаны працягвалі ўзрываць рэйкі, часам нават і на лініях, якія не дзейнічалі” [8, с. 530].

Выключную значнасць для асэнсавання “рэйкавай вайны” мае зборнік дакументаў і матэрыялаў «Партизаны в операции «Багратион» [10]. Аналіз апублікаваных крыніц ставіць яшчэ больш даследчых пытанняў адносна вынікаў рэалізацыі аперацыі. Так, паводле радыёграм, падрыхтаваных В. З. Каржом на імя І. М. Дзікана, паведамлялася, што за дзве першыя ночы

брыгадамі злучэння Пінскай вобласці былі ўзарваны: адпаведна першай радыёграме – 5689 рэек, паводле другой – 7989. У трэцяй радыёграме фігуравала іншая лічба – 4912. А ў апошняй Герой Савецкага Саюза В. З. Корж паведамляў, што партызанскімі злучэннямі Пінскай вобласці ўзарвана ўсяго 3912 рэек [10, с. 59]. У выніку начальнік опергрупы БШПР на 1-м Беларускім фронце быў вымушаны адзначыць, што “нельга прыйсці да высновы, колькі ўзарвана рэек” [10, с. 59]. Выконваючы абавязкі камандзіра партызанскай брыгады “Навальніца” Віцебскай вобласці А. Д. Варвашэня 24 чэрвеня 1944 г. паведамляў П. К. Панамарэнка аб “невыкананні загада аб нанясенні ўдару па чыгуначных камунікацыях” [10, с. 56]. Аператыўныя зводкі № 40 і № 41 БШПР аб баявой дзейнасці партызанскіх фарміраванняў [10, с. 198–205, 241–247] таксама не праліваюць святло на стан рэчаў. Першы дакумент паведамляе, што партызанскія брыгады і атрады, выконваючы загад аб масавым знішчэнні рэек на чыгунцы Беларусі з 20 чэрвеня па 5 ліпеня ўзарвалі 58 517 рэек, пусцілі пад адхон 102 эшалоны, разбілі і падпалілі 98 паравозаў і 628 вагонаў [10, с. 199]. У другой зводцы сцвярджаецца, што з 20 чэрвеня да 20 ліпеня было ўзарвана 59 017 рэек і пушчана пад адход 96 варожых эшалонаў [10, с. 241], але колькасць пушчаных ад адход эшалонаў у першай зводцы перавышае лічбу ў другой зводцы. У выніковай даведцы БШПР аб баявой дзейнасці партызан у перыяд падрыхтоўкі і правядзення аперацыі “Баграціён” прыводзяцца даныя, што партызанамі пушчаны пад адхон 101 вайсковы эшалон праціўніка, разгромлены 4 станцыі, узарвана 60177 рэек, 12 чыгуначных мастоў [10, с. 298].

У гэтым кантэксце актуальным з’яўляецца пытанне, у сувязі з чым адбылося такое кардынальнае скарачэнне вынікаў дзейнасці партызан падчас ажыццяўлення аперацыі “Баграціён” адносна колькасці пушчаных пад адхон нямецкіх эшалонаў у параўнанні з, напрыклад, ліпенем 1943 г., калі, як сцвярджаецца ў працы “Страна в огне”, у разгар жорсткіх баёў на Курскай дузе беларускімі партызанамі быў пушчаны пад адхон 761 эшалон і 2 бронецягніка праціўніка [8, с. 525].

Вывучэнне пытання немагчыма без звароту да замежнай гістарыяграфіі і крыніц германскага паходжання. Крок у гэтым кірунку у айчыннай гістарыяграфіі быў зроблены на падставе вывучэння захаваных ў фондах (Фонд 378) Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь дакументальных матэрыялаў германскай акупацыйнай службы транспартнага забеспячэння – Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» [11].

У замежнай гістарыяграфіі прадстаўлены іншы погляд на праблему, пабудаваны на дакументальных матэрыялах архіваў Беларусі, Расіі і Германіі, а таксама вывучэнні германскай гістарыяграфіі. На падставе нямецкіх крыніц Б. Мусял у працы “Савецкія партызаны 1941–1944. Міфы і рэчаіснасць” сцвярджае, што ўжо ў ліпені 1943 г. акупацыйныя ўлады адзначалі значны рост выніковасці сабатажу на чыгунцы, а таксама шматлікія напады, звязаныя са стварэннем пагрозы для важных дарог, што

паказвала імкненні партызанаў спыніць рух па шляхах дастаўкі тылу групы арміі “Цэнтр” [12, с. 319]. Адначасова падкрэсліваецца, што ўжо ў верасні немцы хоць і адзначалі істотны рост атак партызан на чыгунку, але здолелі ў асноўным апанаваць сітуацыю і транспартныя лініі функцыянавалі без асаблівых праблем. Вывучаючы дакументы ЦШПД аўтар сцвярджае, што галоўнай прычынай згортвання аперацыі “Канцэрт” з’яўлялася адсутнасць выбухоўкі, бо першапачаткова планавалася даставіць партызанам 220 тон выбуховых матэрыялаў, 90 тон з якіх вызначалася для беларускіх партызанаў, але ў выніку яны атрымалі толькі каля 47 тон [12, с. 319]. Дакументы, змешчаныя ў фондзе 378 Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь, паказваюць, што штодня акупацыйнымі структурамі адзначаліся некалькі дзясяткаў нападаў. Дыверсіі значна ўскладнялі рух па чыгуначным магістралям, але рэдка даходзіла да спынення руху на некалькі дзён. Звычайна рамонтныя брыгады былі здольны ажыццявіць рамонт за 2–8 гадзін. З германскага боку амаль не было параненых, вельмі рэдка здараліся забойствы. Не адзначалася ніводнага выпадку поўнага знішчэння ваенных цягнікоў [12, с. 329].

Такім чынам, па цяперашні час застаюцца без адказаў некаторыя важныя пытанні, датычныя баявых дзеянняў беларускіх партызан на чыгунцы ў сферы дзейнасці галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск». Напрыклад, наколькі эфектыўнай з’яўлялася баявая дзейнасць у кантэксце параўнання звестак аб агульнай колькасці дыверсій на ўсёй часова акупаванай савецкай тэрыторыі; у якой ступені можна лічыць рэальнымі прыведзеныя лічбы аб нямецкіх стратах, у тым ліку разам з мясцовымі служачымі чыгункі; якое выпрабаванне ўяўляла насамрэч для германскай ваеннай чыгуначнай службы знішчэнне згаданых у савецкай статыстыцы сотняў тысяч рэек. Пошук адказу на адзначаныя пытанні ляжыць праз выкарыстанне ўсіх наяўных дакументаў савецкага і германскага паходжання, а таксама кампаратыўнага вывучэння айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

### Спіс літаратуры


1 **Цанава, Л. Ф.** Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков / Л. Ф. Цанава. – Минск : Госиздат БССР, 1950. – Ч. 2. – 1035 с.

2 Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. Т. 2 / гл. редкол. : А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск, 1984. – 551 с.

3 Концерт // Большая советская энциклопедия : в 30 т. Т. 13. – М. : Сов. энцикл., 1973. – С. 95.

4 Концерт // Великая Отечественная война 1941–1945 : энцикл., / под. ред. М. М. Козлова. – М. : Сов. энциклопедия, 1985. – С. 367.

5 **Пономаренко, П. К.** Всенародная борьба в тылу немецко-фашистских захватчиков 1941–1944 / П. К. Пономаренко. – М. : Наука, 1986. – 440 с.

6 **Лемяшонак, У.** Рэйкавая вайна / У. Лемяшонак // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 6. К. 1. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2001. – С. 168.

7 **Лемяшонак, У.** Канцэрт / У. Лемяшонак // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 4. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 1997. – С. 95.

8 Страна в огне : в 3 т. Т. 2. Коренной перелом. 1942–1943 : В 2 кн. Кн. 1. Очерки / отв. ред. А. М. Литвин, Ю. А. Никифоров. – М. : Абрис, 2017. – 734 с.

9 **Панамарэнка, П. К.** Рэйкавая вайна / П. К. Панамарэнка, У. І. Лемяшонак // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 547–548.

10 Партизаны в операции “Багратион”: документы и материалы / Департамент по архивам и делопроизводству, Министерство юстиции Республики Беларусь, Национальный архив Республики Беларусь. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2014. – 412 с.

11 **Новікаў, С. Я.** Беларускія партызаны ў аперацыі Баграціён / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 8. – С. 4–12.

12 **Новікаў, С. Я.** Дыверсійная дзейнасць партызан Беларусі ў 1943 г. (на матэрыялах калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск») / С. Я. Новікаў, А. Г. Цымбал // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7 крас. 2011 г. Вып. 10 : у 2 т. Т. 1 / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2012. – С. 192–196; Цымбал, А. Г. Дакументы Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» як крыніца па гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі (кастрычнік – пачатак лістапада 1943 г.) / А. Г. Цымбал // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. Вып. 8 / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2013. – С. 22–29.

13 **Musiai, B.** Sowieccy partyzanci 1941–1944. Mity i rzeczywistoњж / B. Musiai. Przeklad z niemieckiego E. Stefacska. – Poznac: Zysk i S-KA, 2014. – 654 s.

УДК 94(476) «1941/.45»

# БУДА-КОШЕЛЁВСКИЙ РАЙОН В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

*Г. М. ЧАЯНКОВА*
*Белорусский государственный университет транспорта, г. Гомель*

В первые дни Великой Отечественной войны в Буда-Кошелёвском и Уваровичском районах были проведены собрания партийно-советского актива, на которых обсуждались вопросы проведения мобилизации в Красную Армию, организация жизни района в условиях войны. В первые дни мобилизации 11 тысяч жителей стали красноармейцами.

Большой патриотический подъем вызвало постановление ЦК КП(б)Б об организации сбора средств в фонд обороны страны от 6 августа 1941 года. 6 тысяч рублей собрали жители Буда-Кошелевского и 10 тысяч рублей Уваровичского района.

В районах формировались истребительные батальоны и отряды народного ополчения. Так, в Буда-Кошелёвском отряде насчитывалось 310 бойцов. Ополченцы охраняли коммуникации, линии связи, уничтожали вражеские